№ 236 (1300)
Аўторак, 18 снежня 2001 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Кошт: у кіёсках і крамах — 120 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

Пейджинговую связь редакции обеспечивает
МОБИЛКОМ
пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

Ціхі з'езд

Напярэдадні з'езда грамадскага аб'яднання БНФ "Адраджэньне" распаўсюджваліся самыя розныя чуткі. Сцвярджалася, што палітычнай кар'еры Вінцука Вячоркі будзе канец, што пераможа Вячаслаў Сіўчык. Але, як кажуць, з вялікага грому заўсёды малы дождж.

Вінцук Вячорка: што нас чакае заўтра?

Фота IREX/ProMedia.

З'езд, у якім удзельнічала амаль 400 дэлегатаў, прайшоў спакойна. Нават эмацыйных выступаў амаль не было. Уся напруга была "за кулісамі" і напярэдадні з'езда, калі ішла барацьба за вылучэнне дэлегатаў і за прызнанне іх паўнамоцтваў — вядома ж, ад гэтага залежалі і вынікі выбараў і ўся далейшая палітыка БНФ.

З дакладам выступіў старшыня грамадскага аб'яднання БНФ "Адраджэньне" Вінцук Вячорка. У паўгадзіннай справаздачы ён падсумаваў дастаткова сціплыя вынікі працы і барацьбы. Супярэчліва прагучала з вуснаў Вячоркі "спартыўная" ацэнка прэзідэнцкіх выбараў — 1:1, ці нічыя. Можна было б меркаваць, што краінай кіруюць адначасова Лукашэнка і Ганчарык. Але кіраўнік БНФ меў на ўвазе "парытэт стратаў". Па яго меркаванні, хаця Лукашэнка і пры ўладзе, але ж таталітарызм у грамадстве ўжо не пераважвае, а людзі пачынаюць прагнуць свабоды, незалежнасці і дэмакратыі. Тое, што такія адзнакі носяць супярэчлівы характар, прадэманстраваў адзін з удзельнікаў дыскусіі — Станіслаў Суднік з Ліды. Ён таксама ўдзельнічаў у выбарчым матчы, але, на ягоную думку, лік 5:0 на карысць Лукашэнкі. "Ён яшчэ пяць гадоў будзе кіраваць краінай, а ў нас будуць нулявыя вынікі".

Бліжэйшыя перспектывы дзейнасці грамадскага аб'яднання БНФ "Адраджэньне" В.Вячорка акрэсліў двума накірункамі: барацьбой супраць "саюзнай дамовы" і падрыхтоўкай і ўдзелам у мясцовых выбарах. Але гэта, па яго словах, будзе рабіцца на падмурках рэальнасці, спакойна, з разлікам уласных сіл.

Самым драматычным момантам з'езда былі выбары. Як і меркавалася, у якасці альтэрнатыўнага кандыдата вылучыўся Вячаслаў Сіўчык. Рыхтуючыся да такой падзеі, ён нават знешні выгляд змяніў — зрабіў новую прычоску, апрануўся ў касцюм з гальштукам замест больш звыклага швэдра. У сваёй справаздачы, якую ён хутка прачытаў, не адрываючыся ад паперкі, гаварыў аб уласных і партыйных памылках, аб пазамінулагоднім расколе ў БНФ: "Пад дыктоўку кіруючага рэжыму, з адкрытым выкарыстаннем сілавых структур Фронт падзялілі". Сіўчык з'яўляецца прыхільнікам замірэння з існуючай Кансерватыўна-Хрысціянскай партыяй — БНФ. А гэта дастаткова непапулярная пазіцыя ў крыле, якое ўзначальвае Вячорка. Таму і вынікі галасавання былі прадказальныя. За Вячорку — 246 дэлегатаў, за Сіўчыка — 81. І хаця яго абралі ў Сойм, Сіўчык на другі дзень у рабоце з'езда ўдзелу ўжо не прымаў. І нават мабільны тэлефон адключыў, каб не турбавалі журналісты. Намеснікамі Вячоркі абраны Юрый Хадыка, Віктар Івашкевіч, Павел Севярынец, Галіна Семдзянава—тыя, хто і быў прапанаваны Вячоркам. Былы намеснік Анатоль Федараў і дваццаціпяцігадовы Аляксей Янукевіч, які перад з'ездам правёў сапраўдную кампанію па сваім выбранні, засталіся без пасад.

У зале было холадна. Члены прэзідыума куталіся ў паліто. Прыклад з іх хутка ўзялі тыя, хто сядзеў у партэры, што надала выгляд нейкай рэвалюцыйнасці гэтаму спакойнаму і прадказальнаму з'зду. Хаця падчас яго правядзення і не абышлося без маленькай бойкі, калі нейкага самазванца з тумакамі выкідвалі з залы. Інцыдэнтам можна назваць і тое, што нехта невядомы адчайна распісаў муры Палаца культуры словам "нацыя".

Генадзь БАРБАРЫЧ,
спецыяльна для "Народнай волі".

ВІЛЬНЮС—МІНСК

Пра што змаўчала "разведка Гаркуна"...

Уладзімір ГЛОД

Усе папярэднія спробы цывілізаванага свету станоўча паўплываць на сітуацыю ў Беларусі канчаліся аднолькава — безвынікова. Як толькі Захад спрабаваў хоць трохі падкруціць гайкі, у Мінску адразу пачынаўся лямант аб двайных стандартах у адносінах да Беларусі. Ды і на самім Захадзе знаходзіліся "разумнікі", якія папярэджвалі: не трэба моцна ціснуць на Лукашэнку, бо ён адразу яшчэ больш цесна сядзецца з Расіяй. І не націскалі. Адзін красамоўны прыклад — нават Злучаныя Штаты Амерыкі, якія вылучаюцца найбольш прынцыповай пазіцыяй у адносінах да беларускага рэжыму, толькі за 2001 год выдаткавалі на гуманітарную і іншую дапамогу Беларусі больш, чым яны змаглі вылучыць апазіцыі за сем апошніх год. Калі ж паслухаць лукашэнкаўскіх прапагандыстаў, дык у іх, як звычайна, усё ставіцца з ног на галаву — яны толькі і балбочуць пра нейкія мільёны для апазіцыі, пры гэтым спецыяльна не называючы велізарныя сумы, якія тая ж Амерыка ўкладвае ў справу ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў нашай краіне.

Палітыка перніка ў адносінах да Лукашэнкі апошнім разглядаецца толькі праз адну прызму — слабасці тых, хто ідзе на такія крокі. Таму і не прыносяць ніякага плёну ўсе спробы насаліць альбо задобрыць Лукашэнку.

І вось падобна на тое, што Еўропа знайшла трэці шлях уздзеяння на беларускую сітуацыю. Цяпер на Беларусь спрабуюць паўплываць праз яе бліжайшую суседку — Літву. Нездарма ў лістападзе выязное пасяджэнне Палітычнага камітэта Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы прайшло ў Вільнюсе. Прайшло за зачыненымі дзвярыма, без запрашэння беларускага боку — як афіцыйнага, так і апазіцыянераў.

Пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Гаркун на тым пасяджэнні не прысутнічаў, пра што і сказаў у інтэрв'ю Беларускаму тэлебачанню. Але, паводле Гаркуна, якому "данесла разведка", кожны другі з выступаючых казаў пра тое, што Беларусь трэба вярнуць у Еўропу. Як высветлілася, Уладзімір Гіляравіч, мякка кажучы, чуў звон, але не ведаў, адкуль ён. А можа, і ведаў, але прывучаны партыйна-савецкай сістэмай былы партыйны і ўрадавы дзеяч цудоўна разумее: галоўнае — пусціць пыл у вочы. Што ён і зрабіў.

А цяпер паслухаем Альвідаса Медалінскаса — намесніка старшыні камітэта па міжнародных справах парламента Літвы. Ён, у адрозненне ад Гаркуна, на пасяджэнні за зачыненымі дзвярыма прысутнічаў і сказаў наступнае: *"Аб вяртанні Беларусі ў міжнародную супольнасць казаў не кожны другі, а кожны з выступоўцаў. Але ж пры гэтым кожны казаў, што зрабіць гэта немагчыма да той пары, пакуль улады Беларусі першымі не зробяць крок насустрач Еўропе. Мы правялі вельмі цікавую дыскусію наконт адкрыцця Беларусі для розных міжнародных праектаў, міжнароднага супрацоўніцтва. Мы казалі пра жаданне бачыць Беларусь у еўрапейскай супольнасці і пры гэтым, таксама казалі аб тых праблемах і цяжкасцях, якія стварае на гэтым шляху сама Беларусь. Прычым, на маю асабістую думку, справа, магчыма, нават не ў тым, каб Беларусь вярнулася ў нейкія фармальныя міжнародныя арганізацыі; больш важна, каб гэтая краіна ўдзельнічала ў тых рэальных працэсах, якія захапілі сёння ўсе краіны Еўропы, незалежна ад таго, ці яны ўжо члены Еўрасаюза, ці не".*

Альвідас Медалінскас расказаў і пра тыя дыскусіі, якія шлі вакол прапаноў увесці ў Беларусі пасаду амбудсмена і ўвесці мараторый на пакаранне смерцю. Па словах літоўскага парламентарыя, гэтыя ўмовы ўзгадваліся не як самастойныя і не як замена некаторых чатырох вядомых умоў, што вылучыла міжнародная супольнасць для Беларусі. Гэта толькі развіццё чатырох прынцыпаў.

Асобая роля Літвы тлумачыцца не толькі яе суседствам з Беларуссю. Цяпер Літва старшынствуе ў Савеце Еўропы. І менавіта таму на яе ўскладаюцца асаблівыя надзеі. Аднак ці па сілах такая незвычайная задача краіне-суседцы? Свой прагноз наконт гэтага я папрасіў выказаць аднаго з самых вядомых літоўскіх палітыкаў Вітаутаса Ландсбергіса.

"Мы яшчэ вельмі добра памятаем забойства на літоўскай мяжы нашых памежнікаў, — гаворыць Вітаутас Ландсбергіс. — *Мы ведаем, хто гэта зрабіў, гэта латышскія і літоўскія АМАПаўцы. І гэтыя людзі цяпер хаваюцца ў Расіі і Беларусі. А яшчэ да гэтага, ў студзені 1991 года, было забойства мірных людзей у Вільнюсе. Адным са злачынцаў з'яўляецца генерал Усхопчык, цяперашні намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь. Яго прызначылі на гэтую пасаду, хаця цудоўна ведалі, што за ім цягнецца "гончы ліст літоўскага правасуддзя". Значыць, гэта было зроблена спецыяльна, каб стварыць перашкоду для развіцця адносін паміж Літвой і Беларуссю. Магчыма, што Літва змагла б паспрыяць, каб сітуацыя з дэмакратыяй у Беларусі не пагаршалася. І гэта быў бы добры знак, на які вельмі разлічвае Еўрасаюз, і, мабыць, таму Еўропа нават заплюшчвае вочы на пераслед уладамі свабоднай прэсы ў Беларусі. Сёння Літва ў цяжкім становішчы. Яна мае добрую волю і вялікае жаданне паспрыяць Беларусі, і ў той жа час наша краіна з-за ўжо ўзгаданых прычын выстаўлена на такое маральнае выпрабаванне..."*

Былы старшыня літоўскага парламента так і не даў адказу на пытанне, ці выканае Літва тыя функцыі, на якія так разлічвае Савет Еўропы. Не даў таму, што ў гэтай справе, на яго погляд, больш залежыць ад кіраўніцтва Беларусі, а не ад добрай волі суседкі — Літвы.

Махляр за тры месяцы зарабіў 2 мільёны рублёў

Спосаб для такога заробку Ігар Н. з Брэста знайшоў у нататцы газеты "Аргументы и факты" пад рубрыкай "Уголок О.Бендера". Атрымліваючы ад яго каштоўныя лісты, прадстаўнікі фірм плацілі за іх ад 6 да 9 тысяч рублёў, з якіх каля тысячы атрымлівала пошта, астатняе — махляр.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Калугина не отпустили под подписку о невыезде

Бывший генеральный директор Производственного объединения "Атлант" Леонид Калугин по-прежнему удерживается под стражей в следственном изоляторе Управления внутренних дел Мингорисполкома. Руководство следственной группы отказалось удовлетворить ходатайство об изменении или отмене меры его удержания.

Заметим, что он был задержан 21 ноября и обвиняется в совершении преступлений по статьям 424, ч.3 (злоупотребление властью или служебными полномочиями), 225 (невозвращение из-за границы валютных средств) и другим. Господин Калугин своей вины не признает. После ареста он на четыре дня объявил голодовку, которую прекратил из-за проблем со здоровьем.

По словам его адвоката Александра Пыльченко, Леонид Калугин держится в изоляторе мужественно. Адвокат также считает, что в его действиях не было состава преступления, так как директор пробовал спасти предприятие от остановки производства. Однако следователи, поскольку они не удовлетворили ходатайство адвоката, наверное, считают по-другому.

Василий СЕРГЕЕВ.

ЗАКУЛИСЬЕ

Александр Лукашенко не рискнул остаться в чисто мужском окружении

Как известно, на прошлой неделе на должность пресс-секретаря Лукашенко была назначена Наталья Петкевич. Эта новость вызвала некоторую растерянность в журналистских кругах: о Наталье Петкевич ранее никто ничего не слышал. Правда, в этом ничего удивительного нет — Наталья Петкевич по образованию не журналист, а юрист, работала начальником управления государственного и международного права Государственно-правового управления Администрации президента.

Буквально на следующий день после назначения Наталья Петкевич была представлена сотрудникам президентской администрации. Многие отметили, как хороша и свежа новая сотрудница в элегантном костюме. Правда, черный бант в волосах придавал ей некоторую схожесть то ли с дореволюционной гимназисткой, то ли с образцово-показательной школьницей-комсомолкой.

Наталье Петкевич слегка за 30. Она моложе очаровательной Ирины Абельской. По всей вероятности, отправив Ирину Степановну создавать "школу современной медицины", Александр Григорьевич не рискнул остаться в чисто мужском окружении. Видимо, вдохновение в политических и экономических прозрениях Лукашенко черпает все же в женском обществе. Одно несомненно: у Александра Григорьевича дар распознавать таланты в молодых прелестных дамах.

К слову, должность пресс-секретаря имеет статус помощника президента. Наталья Петкевич будет не только информировать общественность о деловых поездках Лукашенко, но и руководить всей президентской пресс-службой, все сотрудники которой — мужчины.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ЛИЧНЫЙ ВЗГЛЯД

100 дней власти,

или "В фазе мертвого Солнца"

В субботнем номере "Народной воли" известный журналист Александр Старикевич порассуждал на тему "100 дней оппозиции". То есть о том, как зарекомендовали себя оппоненты Лукашенко после так называемых президентских выборов. Я же хочу порассмышлять на тему "100 дней власти".

Именно 100 дней прошло после "элегантной победы" А.Г. И что же нового? А ничего! В принципе, по большому счету — "нулевой вариант". Как жили белорусы в большинстве своем внатяжку, так и живут. Та же, что и прежде, политическая трескотня в государственных СМИ, особенно в самых "честных" газетах и на БТ, популистские "мозговые атаки" на рутинных, ритуальных совещаниях, заседаниях и других "разборках" с грозными требованиями "улучшить", "совершенствовать", "повышать", "проверять", "контролировать" и "спрашивать"...

Впрочем... новое все-таки есть. Назначен "свежий" премьер-министр Г.Новицкий. Но он сам уже не раз заявлял: без солидных, масштабных и системных инвестиций, без весомых кредитов экономику Беларуси "не сдвинуть". А откуда взяться деньжатам-то? Разве что — от манны небесной... Запад, Европа — особенно после "изящного" мухлежа с результатами недавних выборов, еще долго будут выжидать, колебаться, осторожничать. Остается идти на поклон, а точнее, в кабалу к российским олигархам, что Лукашенко в последнее время и делает. Хотя в своих предвыборных обещаниях клялся не делать этого.

Еще "новинка" — неожиданные "наезды" на коррупционеров в "Атланте", в управлении Белорусской "чыгункі" — с визгливой свистопляской в "честных" газетах и по БТ. Подноготная этих "разоблачений" и арестов угадывается, как летний гром после молнии, как гололед после неожиданной зимней оттепели. **А.Г. просто надо во чтобы то ни стало любым путем, любым способом "сбить волну" общественного негодования после разоблачительных публикаций в независимой прессе, где приводились подлинные официальные документы, свидетельствующие о причастности высших должностных лиц государства к исчезновению Гончара, Захаренко, Красовского, Завадского...** Мы хорошо помним, как Ольга Абрамова в "палате представителей" задала ну оч-ч-чень неудобный вопрос Александру Григорьевичу насчет того, как бы побыстрее учредить специальную независимую комиссию по расследованию обстоятельств исчезновения (или скорее всего УБИЙСТВА) этих людей. Лукашенко обещал "посодействовать". Где же эти "действия", господин-товарищ Александр Григорьевич? Или эти "громкие дела" будут заболтаны, замылены, замусолены, окончательно развалены так же, как известные в России дела о загадочных убийствах отца Меня, журналистов Листьева и Холодова, популярнейшего политика и народного депутата Галины Старовойтовой, певца Игоря Талькова, генерала Льва Рохлина?.. Если мы, граждане Беларуси, особенно демократическая творческая интеллигенция, элита общества позволим власти сделать ЭТО, — разве тогда мы вправе народом зваться?!

А.Лукашенко и его подхалимажное окружение хвалится: экономика движется вперед в заданных параметрах и объемах! Госпропагандисты раструбили на весь мир о том, что стодолларовые доходы трудящихся чуть ли не рекорд книги Гиннесса. Этот "художественный свист" слышен с начала года. Но ведь с тех пор цены выросли чуть ли не в полтора раза! Налицо — чистейшей воды обман, демагогия. Да и много ли добра, продуктов питания можно приобрести сегодня на теперешние 150 тысяч "зайцев" (аналог ста "баксов")?! "Подставлю" в качестве примера на публичный глаз и суд читателей себя — для пущей убедительности. В начале 80-х я, будучи майором доблестных Вооруженных Сил СССР, получал 360 вовсе не деревянных "рэ". Сейчас — порядка 130 тысяч, которые не поменяешь на порядочную валюту даже в Киргизии... Тогда на свои кровные я мог купить — прошу пардон за трюизм! — почти центнер (!) добротной колбасы, чуть ли не десять пудов (!) вполне симпатичных, смачных кур, супруге Цветане — три пары моднейших французских сапожек, пять раз слетать на самолете (туда и обратно) на свое любимое Азовское море за уникальным южным загаром и потрясающей икряной таранкой... Или, да простят меня трезвенники, сто бутылок водки, или 80 — неслабого трехзвездочного молдавского коньяка, или полста штук бутылок совершенно изумительной болгарской "Плиски"... (Правда, все эти дефицитные товары, деликатесы удавалось "достать" лишь в "спецмагазинах" и "столах заказов" и об этом — отдельный разговор.)

Теперь прикиньте, братья и сестры: что можно купить на сегодняшнюю среднюю зарплату "с гулькин нос" или пенсию в 50—70 тысяч? Когда более-менее "удобоваримая" колбаса тянет 7—8 тысяч за килограмм, когда даже осмеянная Райкиным чисто пролетарская, некогда копеечная селедка, даже полуистлевшая сушеная вобла, когда-то мешками валяющаяся в окопах первой мировой, сегодня "среднестатистическому" гражданину или гражданке независимой Беларуси просто не по карману! А "батька" с его не в меру голосистыми "орфейчиками" и "птичками-певичками" тужатся убедить нас в том, что в Беларуси уже почти достигнут "советский уровень жизни". Врут — и не краснеют!

***

И с чего, спрашивается, нам богатеть? Инвестиций, как я уже говорил, — кот наплакал. А без них и не туда, и не сюда... Их, по большому счету, и не будет, пока Лукашенко у власти. Это стало окончательно ясно после недавнего заявления госсекретаря США Пауэлла. После того как А.Г. не раз показывал Западу кукиш с маслом, простите за грубое выражение, похерил все критические замечания ОБСЕ, ПАСЕ, Госдепа США о фактической неправомочности прошедших президентских выборов, серьезных чистых денег "из-за бугра" нам не видать до второго пришествия Христа...

Так кто же нам поможет? Пал Палыч Бородин — человек, корчащий из себя рыцаря без страха и упрека, но в то же время боящийся слово сказать на многочисленных допросах в швейцарской прокуратуре, где он молчит, "как рыба об лед"? "Лукойл" с "Газпромом" и "Итэрой", где правят бал матерые финансовые махинаторы и грязнохваты? Или нищая Северная Осетия с каким-нибудь ближневосточным султанатом с Саддамом Хусейном, Муамаром Каддафи?..

Не кажется ли Вам, Александр Григорьевич, что Ваш и Вашей "сборной" поезд давно ушел? И напрасно Вы сейчас чуть ли не ежедневно говорите об "акционировании предприятий", "амнистии капиталов", ведете явное заигрывание с бизнесменами и предпринимателями... Кто, кто из серьезных, дальновидных бизнесменов пойдет на сотрудничество с Вашей властью, которая, по известному указу, могла запросто, в одночасье, без суда и следствия конфисковать имущество любого "подозрительного" гражданина-частника в свою пользу?!

***

В октябре 1917-го (по старому стилю) II Всероссийский съезд Советов провозгласил: "Мир — народам. Земля — крестьянам. Фабрики и заводы — рабочим. Власть — Советам". Все это оказалось великим блефом, туфтой. Циничной коммуно-большевистской ложью. В которой, как в прогнившем и вонючем болоте, мы до сих пор живем... Иногда поражаешься: до чего же много у нас, в Беларуси, неправильного, ненастоящего, тусклого, серого, ложного, лицемерного... "Белорусское чудо" — где оно? В карманах эмвэдэшных полковников, получающих в 5—7 раз больше, чем учитель, врач, архитектор, поэт или писатель, артист, воспитательница детского садика? Президента считает нелегитимным не только оппозиция, но и большинство цивилизованных стран. Парламент — карманный. СМИ — "прихватизированы". "Прихватизированный" кем — властью, которая беспомощна, неумела, безнравственна, невежественна... Страна будто бы живет в фазе Мертвого Солнца. В литературе — застой, в искусстве — полный штиль. Подкаблучные СМИ бессовестно врут, холуйствуют. **За семь лет режим не смог родить ни одной более-менее заметной, значимой крупной политической фигуры, управленческой ЛИЧНОСТИ** или хоть одного стоящего политолога, телекомментатора масштаба российских Познера, Киселева, Ревенко, Прошутинской, Агалаковой, Петровской, Маркова, Бунина, знаменитого Глеба Павловского?.. "Где те, скажи, Отечества отцы, которых мы должны принять за образцы?". Снова в верхах затевается остобрыдлая тягомотина то ли с "разговорами", то ли с "переговорами" власти и оппозиции, где деятели из Красного дома тверды и непреклонны, как Робеспьер, призывая оппозицию смириться с тем, что в республике все утряслось после 11 сентября...

НЕ ВЕРЮ!

Вспомнил Андрея Макаревича:

И мотор ревет —
новый поворот.
Что он нам несет?
Омут или брод?
Пропасть или взлет?
Ты не разберешь,
Пока не повернешь...

Беларуси, обществу, власти нужен решительный и качественный ПОВОРОТ. Еще вчера. Впрочем, и сегодня еще не поздно. Но не туда, не по пути "великого Октября", куда завели республику и где заблудились наши новоявленные сусанины...

Александр ОЛЬХОВОЙ.

ВНИМАНИЕ: КОНКУРС!

Подписался на "Народную волю" — выигрывай еще телевизор или холодильник

Давно мы не проводили конкурс среди подписчиков "Народной воли". Нынче, несмотря на сложную финансовую ситуацию, редакция все же решила вернуться к этой игре.

Среди призов, которые получат победители конкурса — телевизоры, радиоприемники, холодильники, велосипеды, предметы бытового назначения, спортивный инвентарь, литература и т.д. Итоги розыгрыша будут подведены в канун Нового года с участием читателей газеты. Для участия в конкурсе Вам следует направить в редакцию копию оформленного и оплаченного подписного бланка на первую половину 2002 года с пометкой **"Конкурс"**. Подписка должна быть не менее чем на два месяца.

Удачи, друзья!

Редакция газеты "Народная воля".

Подпишись и ВЫИГРАЙ!
Твоя "Народная воля".

Будзем разам!

Ідзе падпіска на "Народную волю" на першую палавіну 2002 года. Ведаем: жыць цяжка, але без вольнага, праўдзівага слова — яшчэ цяжэй. Давайце будзем разам змагацца за праўду і лепшае жыццё! Вас чакаюць на пошце і на пунктах падпіскі "Белсаюздруку".

Ільготны індэкс 63429 (для пенсіянераў, інвалідаў, уладальнікаў паўгадавой або квартальнай падпіскі:
1 месяц — 2 800 рублёў;
3 месяцы — 8 400 рублёў;
6 месяцаў — 16 800 рублёў.

Кошт падпіскі па індэксе 63222 (для індывідуальных падпісчыкаў):
1 месяц — 3 000 рублёў;
3 месяцы — 9 000 рублёў;
6 месяцаў — 18 000 рублёў.

Ведамасная падпіска (індэкс 63225):
1 месяц — 7 000 рублёў;
3 месяца — 21 000 рублёў;
6 месяцаў — 42 000 рублёў.

ПРОДАЕМ
20 тонн продовольственного картофеля (в сетках)
Тел: 206 - 69 - 06

Народная Воля
18 СНЕЖНЯ 2001 г.

ПУЛЬС

Мінск, плошча Незалежнасці.

Фота IREX/ProMedia.

Магілёўская вобласць — на парозе эпідэміі грыпу

Уступілі ў дзеянне мерапрыемствы комплекснага плана прафілактыкі гэтага захворвання, прыняты частковыя абмежаванні на правядзенне масавых мерапрыемстваў і відовішчаў.

Найбольш цяжкае эпідэмічнае становішча складваецца ў другім па велічыні горадзе вобласці — Бабруйску. Тут узровень захворвання на грып перавысіў эпідэмічны парог у 2,9 раза. У Магілёве — у 2,2 раза. У абласным цэнтры па медыцынскую дапамогу штодзённа звяртаюцца каля 600 чалавек, якія захварэлі на грып. Эпідэмія абвяшчаецца, калі эпідэмічны парог захворвання перавышаецца ў тры разы на працягу трох дзён.

На думку ўрачоў абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, сёлета ў вобласць прыйдуць вірусы грыпу А і В — тыя, што мелі месца летась і да якіх у многіх жыхароў ужо выпрацаваўся імунітэт. Часткова знізіць узровень захворвання дапамогуць прышчэпкі, якія пачалі рабіць яшчэ ў кастрычніку.

Канстанцін УВАРАЎ.

У Гомельскай вобласці кожны дзесяты — п'яніца

Кожнае пятае правапарушэнне ў краіне прыпадае на Гомельскую вобласць, што з'яўляецца самым высокім паказчыкам, а раскрывальнасць — адна з самых нізкіх у краіне — каля 50 працэнтаў.

Адна з прычын ускладнення крымінагеннага становішча — п'янства насельніцтва. У вобласці налічваецца каля 20 тысяч хранічных алкаголікаў, а 105 тысяч чалавек — кожны дзесяты жыхар працаздольнага ўзросту — прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за п'янства.

Ірына ШАНЦАВА.

На вуліцы Няміга будзе паркінг

Паркінг агульнай плошчай 25 тысяч квадратных метраў працягнецца ад будынка прадпрыемства "Белпраект" да вуліцы Камсамольскай.

Згодна з праектам, з'явіцца новая вулачка, а існуючыя будынкі будуць адноўлены. Паркінг будзе мець некалькі ўзроўняў. Два ніжнія паверхі займуць рэстараны, кафэ, гандлёвыя і дапаможныя плошчы. На верхніх паверхах размесціцца стаянка на 500 месц.

Прынята рашэнне распачаць будаўніцтва ў красавіку—маі 2002 года. Работы разлічаны на паўтара-два гады.

Гістарычная спадчына на тэрыторыі рэалізацыі праекта закранацца не будзе. Даследаванні па рэгенерацыі паказалі, што слой XIX стагоддзя не будзе закрануты. Ёсць таксама план правядзення археалагічных пошукаў, у выніку якіх, магчыма, будуць знойдзены рэшткі сярэдневяковых будынкаў — яны таксама будуць захаваныя.

Лавінія АРЭШКА.

Вучыцца за мяжой можна, не пакідаючы Беларусь

З 2001 года ў Беларусі рэалізуецца трохгадовы праект, падтрыманы ЮНЕСКА, — па трансферы праграмы інфарматыкі універсітэта Мангейма ў Беларусь.

Праект рэалізуецца па тэхналогіях дыстанцыйнага навучання і дазволіць беларускім студэнтам, не пакідаючы краіну, атрымліваць адукацыю ў другім па рэйтынгу універсітэце свету.

"Сумесна з Асацыяцыяй цэнтральна- і ўсходнееўрапейскіх камп'ютэрных сетак (CEENET) намі праводзіцца работа па стварэнні тэхналогіі дыстанцыйнага навучання, — паведаміла ў інтэрв'ю БелаПАН кандыдат тэхнічных навук Гаянэ Вальчэўская. — У Беларусі ўжо больш за дзесяць чалавек навучыліся па Еўрапейскай праграме метадалогіі і тэхналогіі дыстанцыйнага навучання. З беларускага боку ў гэтай праграме бяруць удзел як студэнты, гэтак і выкладчыкі, якія праводзяць навучанне ў дыстанцыйным асяроддзі".

Як зазначыў у гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН дырэктар навукова-інжынернага прадпрыемства "Інфармацыйныя тэхналогіі" доктар тэхнічных навук Міхаіл Маханёк, "тэхналогіі дыстанцыйнага навучання значна павышаюць якасць навучання студэнтаў і могуць прадухіліць адток з краіны таленавітай моладзі, якая жадае атрымаць адукацыю за мяжой".

Юрый КАСЬЯНАЎ.

РЭБУС

Якім жа словам верыць?

На сустрэчы ў сваёй мінскай рэзідэнцыі з даверанымі асобамі, якія працавалі ў яго камандзе на прайшоўшых выбарах, Аляксандр Лукашэнка заявіў:

— Я хачу, каб вы ведалі, што я прэзідэнт Беларусі. І тыя інтарэсы, якія павінны быць захаваны, нашай дзяржавы, нашага народа, нас з вамі, ім ніколі здрады не будзе... Я нікому не здам Беларусь, пакуль я прэзідэнт.

Але ў час гэтай жа сустрэчы ён сказаў і літаральна супрацьлеглае, а іменна:

— Мы зробім усё, што абяцалі ў рамках Саюза Беларусі і Расіі, і пойдзем настолькі далёка ў гэтым Саюзе, наколькі сёння здольна пайсці Расійская Федэрацыя.

"Наколькі далёка здольна пайсці Расійская Федэрацыя", мы ведаем. Вуснамі яе палітыкаў не раз выказвалася думка аб тым, што Беларусь павінна стаць суб'ектам Расіі, а некаторыя нават дамагаюцца, каб нашыя вобласці, кожная паасобку, сталі губернямі Расіі, каб нават не было больш такой назвы, як Беларусь.

Дык што, мы гатовы да гэтага? Якім словам Лукашэнкі верыць?

Алесь ДРАБЧУК.

РЕЗОННЫЙ ВОПРОС

В свои 16 лет я трудился на Победу. И это ничего не значит?

Волею судьбы я, 15-летний подросток, 27 июня 1941 года из горящего Минска попал в Могилев, а оттуда вместе с другими детьми пионерского лагеря "Талька" был эвакуирован в тыл, в г.Кузнец Пензенской области. С июня 1942-го по июль 1946-го, после учебы в ремесленном училище, работал токарем в Новосибирске на комбинате №179, который входил в промышленную отрасль по производству боеприпасов. Работали мы, подростки, как и взрослые, по 12 часов в сутки, без отпусков и выходных.

Прошло много лет. Еще в 1993 году в России было введено положение, согласно которому достаточно записи в трудовой книжке, подтверждающей работу в тылу в военное время, или показаний двух свидетелей — и ты получаешь статус участника ВОВ. А в Беларуси, которую наши правители готовы присоединить к соседке, этого нет. В 55-ю годовщину Победы я написал заявление в Минсоцзащиты РБ о признании меня участником ВОВ. Ответ был таков. Вопрос о признании ветеранами ВОВ всех лиц, работавших в тылу в годы войны, прорабатывался. Но его решение для Беларуси отличается от **практики в других государствах, так как территория нашей республики была полностью оккупирована длительный период.** При этом даже не было сообщено, каким нормативным документом узаконено применение "отличной практики...". Кстати, на мой второй запрос чиновники ответили так: что касается признания ветеранами войны тех лиц, у которых в трудовых книжках есть записи о том, что в годы войны они работали на военных объектах, то каждое государство принимает свои законы; в Беларуси, мол, нет такого закона. И ни слова о том, почему не принимается такой закон.

Как-то Ваша газета напечатала "Исповедь остарбайтера №907", угнанного в Германию на принудительные работы. Меня ждала бы такая же участь, если бы я не попал в советский тыл. Теперь бывший остарбайтер имеет право на солидную денежную компенсацию от Германии. А я?

Ни моя семья, ни знакомые не могут понять, почему я и такие, как я, кто не щадил своих сил, своей юности на трудовом фронте ради нашей общей Победы, теперь оказались в сфере порочной "отличной практики"? Понимаю, Беларусь бедная, но разве я хуже трудился в войну, чем мой товарищ по цеху — русский паренек? А ведь труженики тыла в России и других государствах СНГ имеют льготы, положенные участникам войны.

Наверное, авторам "отличной практики" стоит напомнить высказывание дважды Героя Советского Союза, летчика-космонавта Г.Берегового: "Если бы не было труда миллионов женщин и подростков в тылу, мы бы не праздновали сегодня эту Победу". Но у наших "верхов", видимо, иное мнение...

Бронислав Константинович САДОВСКИЙ, житель г.Минска.

ИЗ ПИСЕМ В РЕДАКЦИЮ

Когда читаю Нила Гилевича...

Когда читаю на страницах "Народной воли" Нила Гилевича, такая жалость одолевает, что впору заплакать. Нет, не от того, о чем пишет Нил. А от того, как пишет, с какой болью бедняга переживает все сегодняшние напасти. Этому человеку хочется сказать шчыры дзякуй! Дзякуй табе, Ніл Сымонавіч, за твой боль...

Виктор Павлович РОМЕЙКО, житель г.Минска.

Зачем так тщательно его охранять?

Александр Григорьевич любит подчеркивать, что за него народ горой стоит. Тогда кого ему бояться? Зачем такая охрана? Понаблюдайте, как он добирается из знаменитых Дроздов на работу — целая кавалькада машин, милиция через каждые сто метров...

Вспомните те времена, когда Станислав Шушкевич ехал из Дома правительства домой — впереди шла "мигалка", а следом — его машина. И ничего не происходило, и не вылетали на ветер народные денежки.

Василий ПЯСЕЦКИЙ, инженер, пенсионер.

Минск.

Ад пераахаладжэння пацярпелі каля 140 чалавек

У перыяд з 7 па 14 снежня ў Беларусі ад пераахаладжэння пацярпелі каля 140 чалавек.

Як паведаміў БелаПАН галоўны ўрач Мінскай гарадской станцыі хуткай дапамогі Віталій Фяцішын, у Мінску, у прыватнасці, за названы перыяд у гарадскія бальніцы, з-за пераахаладжання, трапілі 19 чалавек. Ён адзначыў, што пацярпелыя былі дастаўлены ў аддзяленні прыёмнага пакою з дыягназамі "пераахаладжэнне" і "абмаражэнне канечнасцяў". Прычым большасць з іх знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

Паводле слоў медыка, за гэты перыяд лятальных зыходаў па краіне зафіксавана не было.

Вольга АСІПЕНКА.

ПОЖЕЛАНИЕ

А как у них?

Имея корреспондентов за рубежом (Польша, Германия, США и в других странах), "Народной воле" следовало бы, на мой взгляд, более подробно освещать вопросы сельскохозяйственного производства за рубежом, чтобы наши аграрники могли сопоставить эффективность своего труда (урожайность культур, надои молока, привесы скота, себестоимость продукции, рентабельность, доходность) с эффективностью труда их коллег в других странах. Нужно открывать глаза соотечественникам на нашу действительность. Эти темы для тружеников села весьма важны и актуальны, а газете придали бы больше респектабельности.

Сотрудникам "Народной воли" большое спасибо за глоток чистой правды! Примите мои искренние поздравления по случаю Нового года. Желаю всем счастья, здоровья, а газете — быть в каждой семье, на каждом столе.

При удобном случае передавайте низкий поклон Гончарику Владимиру Ивановичу за его мужество, порядочность, человечность.

Василий ЗЕНКОВИЧ, житель г.Горки Могилевской области.

ВЕРСИЯ

Борисевич снова заговорит на фарси?

12 декабря Александр Лукашенко освободил от должности своего пресс-секретаря Николая Борисевича. Поскольку на службу к главе государства Николай Борисевич пришел из Министерства иностранных дел, логично предположить, что теперь он вернется на дипломатическую стезю. И даже получит должность посла Беларуси в одной из стран. Какой? Возможно, в Иране. Дело в том, что Николай Борисевич один из немногих в Беларуси людей, который достаточно свободно объясняется на фарси. К тому же нельзя не учитывать особую расположенность главы белорусского государства к "неординарным" странам. Да и бывший сотрудник КГБ Беларуси, а позже парламентарий Леонид Рачков, который представляет белорусскую дипломатию в Тегеране, находится в Иране уже пять лет. По дипломатическим канонам, ему уже пора подыскивать другую страну.

Владимир КОТ.

У витрины.

Фото IREX/ProMedia.

"Грыфаманія-2001"

19 снежня ў Палацы культуры Мінскага трактарнага завода пройдзе III фестываль гітарыстаў "Грыфаманія-2001".

Упершыню "Грыфаманія" абмяжуецца адным днём выступленняў віртуозаў гітарнай музыкі (раней фестываль праходзіў два дні), таксама ўпершыню гэта будзе фестываль не толькі для рок-гітарыстаў: стылёвыя рамкі "Грыфаманіі" пашырацца да выканання блюза, джаза, фламенка.

Мэта "Грыфаманіі", паводле слоў дырэктара фестывалю Юрыя Рашэтнікава, — "наладзіць свята для аматараў гітарнай музыкі".

Маша ПЯТРОВА.

Адкрыты турнір "Падкідны дурань"

З 15 па 20 снежня ў мінскім казіно "Белая вежа" праходзіць адкрыты турнір па народнай картачнай гульні "Падкідны дурань".

Усе жадаючыя могуць узяць удзел у турніры, заплаціўшы ўступны ўзнос у памеры 300 тысяч рублёў. Прызавы фонд турніра на сёння складае 3 тысячы долараў ЗША, але, як удакладнілі БелаПАН у казіно, "ён хутчэй за ўсё павялічыцца да 5 тысяч долараў".

Гульня будзе весціся "самнасам" да першага пройгрышу. Увайшоўшым у чвэрцьфінал гульцам вяртаецца ўступны ўзнос, паміж імі ж дзеліцца і галоўны прыз. Уваход для гледачоў вольны.

Лавінія АРЭШКА.

Каманда БДУ — чэмпіён КВЗ

Зборная каманда Беларускага дзяржаўнага універсітэта другі раз стала чэмпіёнам Вышэйшай лігі Міжнароднага саюза КВЗ і першым чэмпіёнам XXI стагоддзя. 15 снежня ў зале Маскоўскага палаца моладзі (МПМ) яна перамагла ў фінальнай гульні каманду "Стомленыя сонцам" (Сочы).

Такой колькасці балельшчыкаў МПМ не бачыў даўно. Пранікліўсе, хто змог сабе дазволіць стаяць на адной назе каля сцен і сядзець на руках тых, хто сядзеў на прыступках. Паняцце "аншлаг" выйшла за свае натуральныя межы.

Гульня ў запісе цягнулася 2 гадзіны 46 хвілін 30 секунд. У эфіры канала ГРТ яна будзе паказана 30 снежня.

БелаПАН.

ДЫСКУСІЯ

Не страляйце ў піяніста ...

Юрась ХАДЫКА, прафесар

У артыкуле "Генсек Браткін" у нумары за 20 лістапада Анатоль Казловіч па-ёрніцку пераказвае трагічную па сутнасці гісторыю чалавека, які атрымаў духоўную свабоду толькі ў сваёй душэўнай хваробе. І хаця Казловіч у пасляслоў'і запэўнівае, што ён не супраць партый, аднак не называе ніводнага прозвішча "генсекаў", з якімі ён асабіста знаёмы і міма якіх яму хочацца незаўважна праслізнуць.

Было б вельмі дзіўна чакаць, каб ва ўмовах беднага грамадства з нясклаўшайся палітычнай культурай і пры поўным панаванні ў інфармацыйнай сферы небяздарных абаронцаў паміраючай сістэмы адразу паўстала цывілізаваная партыйная структура. Наменклатурны клас, клас улады гэтага вельмі баіцца. Таму і намагаецца рознымі сродкамі дыскрэдытаваць рэальную апазіцыю і рэальныя дэмакратычныя партыі. Пазбавіць іх магчымасці дзейнічаць. Таму ім не дазваляецца атрымліваць фінансавую дапамогу з-за мяжы, пры тым што яны пазбаўлены (за выключэннем БПСМ) дзяржаўнай падтрымкі. Хаця такая падтрымка ажыццяўляецца ў любой цывілізаванай краіне. Таму яны пазбаўлены доступу да дзяржаўных СМІ, а ў выбарчым заканадаўстве адсутнічае прапартыйная сістэма галасавання. Такая сістэма існуе ва ўсіх нашых суседзяў і дазваляе партыям, якія маюць падтрымку ў грамадстве вышэй за нейкі парог у 3-5%, мець сваё прадстаўніцтва ў заканадаўчым органе.

Акрамя таго, дэмакратычным партыям супрацьпастаўляюцца партыі кшталту сацыяльна-спартыўнай ці "патрыётаў" памерлага сп.Баранкевіча. Ці ліберальныя дэмакраты сп. С.Гайдукевіча, якія сілкуюцца ад гандлю з Іракам і звычайна выступаюць насуперак рашэнням дэмакратычнай апазіцыі, як гэта было на восеньскіх прэзідэнцкіх выбарах. Я ўжо не кажу пра хлусню, якая лілася з экранаў БТ з вуснаў розных новікавых, казіятак і зімоўскіх і ў значнай меры льецца і цяпер многімі прапагандыстамі рэжыму. І пра амбіцыі лідэраў асобных дэмакратычных арганізацый і партый, якія часам вядуць да ўчынкаў, вельмі падобных на правакацыі. Згадаем паводзіны М.Статкевіча ці А.Фядуты.

Таму ва ўмовах шалёнага змагання дзяржавы з парасткамі дэмакратыі ў Беларусі апазіцыйныя партыі — гэта супольнасці добраахвотнікаў, кінуўшых адкрыты выклік лукашэнкаўскаму рэжыму. Сябры гэтых партый зарабляюць на хлеб надзённы не партыйнай працай ці партыйнымі пасадамі. Вызваленых работнікаў у кожнай дэмакратычнай партыі можна пералічыць па пальцах. Больш таго, як грамадзяне гэтай краіны, а не прышэльцы з Марса, яны часта становяцца ахвярамі сатрапаў "вертыкалі" ці лукашэнкаўскіх сілавых структур.

Такім людзям трэба сказаць дзякуй за тое, што яны неяк ратуюць гонар Беларусі. Канешне, калі згаданыя сп. Анатолем Казловічам "генсекі" прадстаўляюць дэмакратычныя партыі. Калі ж яны з супрацьлеглага лагера, то трэба было б задумацца, чаму яны цягнуць яго ў свае структуры. Ва ўсялякім выпадку, не трэба хаваць свае сапраўдныя адносіны з апазіцыяй і з апазіцыйнымі партыямі за недагаворкамі і намёкамі. Не думаю, што якія-небудзь партыі ці іх "генсекі" пакрыўдзіліся б за шчырасць на сп. Казловіча.

У мяне няма ні падстаў, ні права гаварыць ад імя ўсёй апазіцыі. Абараняць яе ці вучыць. Яна вельмі разнастайная. У ёй ёсць паслядоўныя праціўнікі рэжыму. І непаслядоўныя. І наогул выпадковыя людзі і арганізацыі. Ёсць і засланыя "казачкі" — агенты ахоўных лукашэнкаўскіх структур. (Дзіўна, калі б іх не было). У іх на ілбе не стаіць і не свеціцца каінава пячатка. Спрачацца з імі даводзіцца ў межах, якія прыняты ў цывілізаваным грамадстве. Менавіта таму так цяжка, а часам і позна дасягаецца адзінства дзеянняў апазіцыі.

Думаю, што не мае падстаў вучыць апазіцыю і яшчэ адзін аўтар "Народнай волі" — Аляксандр Альхавы, які надрукаваў свой артыкул у нумары за 21 лістапада. На думку сп. Альхавога, апазіцыя не прайграла, а "позорно, безмозгло, бесталанно продула" выборы. Мабыць, аўтар не сочыць рэгулярна за публікацыямі сацыёлагаў у "Народнай волі". Не так даўно Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў апублікаваў вынікі свайго паслявыбарчага апытання. Яны сведчаць, што А.Лукашэнка насамрэч сабраў ад 50 да 55%. А яго галоўны сапернік, кандыдат ад аб'яднанай апазіцыі У.Ганчарык — ад 27 да 29%. Больш таго, прафесар А.Манаеў, дырэктар інстытута, сцвярджае, што не спазніся на 1—1,5 месяца апазіцыя з вылучэннем "адзінага" кандыдата, яго падтрымка магла б дасягнуць 45%. І гэта нават пры тым, што ўся прапагандысцкая машына рэжыму, увесь яго так званы адміністратыўны рэсурс працаваў на ўтрыманне ўлады ў руках А.Лукашэнкі.

З гэтага, канешне, вынікае, што кампанія апазіцыі сапраўды была бязмозглай і бесталаннай. Бо не дасягнула 45%, як магла. Але гэтую кампанію нельга назваць выбарамі. Яе трэба называць кампаніяй змагання, у якой рэжым, як і абяцаў Лукашэнка, не грэбаваў выкарыстоўваць побач з хлуснёй, паклёпамі і фальсіфікацыяй нават сілу. Шанцаў выйграць гэтую кампанію ў апазіцыі амаль не было. Не дарма ж, каб атрымаць "элегантную перамогу", рэжыму давялося пайсці на маштабныя фальсіфікацыі. Ва ўсім свеце гэта лічыцца крымінальным злачынствам і жорстка караецца законам. У Беларусі гэта завецца "элегантнай перамогай" і служыць падставай для расчараваных дэмакратаў папракаць і вучыць апазіцыю.

Разгубленасць і расчараванасць, якія часта выплёскваюцца на старонкі "Народнай волі", можна зразумець, але не апраўдаць. Так і хочацца параіць усім настаўнікам выбраць сабе партыю па сэрцы і праз яе ў тых умовах, у якіх працуе рэальная беларуская апазіцыя, рэалізаваць свае парады. Бо ў гэтым выпадку не напісаў бы сп. Альхавы пра адносіны апазіцыі да БТ тое, што ён напісаў.

Мне здавалася, што У.Глод, адзін з сяброў экспертнай групы па пытаннях доступу апазіцыі да дзяржаўных СМІ, падрабязна і сістэматычна апісваў у "Народнай волі" перагаворны працэс па гэтым пытанні паміж арганізаванай апазіцыяй і рэжымам. Аднак, магчыма, не толькі сп. Аляксандр, але і чытачы яго артыкула забыліся пра гэтыя публікацыі. Таму могуць падумаць, што крытыка сп. Альхавога — слушная. Насамрэч, усё адбывалася так, як ён раіць, а не так, як ён апісвае паводзіны апазіцыі.

У канцы лета 1999 года па ініцыятыве КНГ АБСЕ апазіцыя ўтварыла Кансультацыйную раду апазіцыйных палітычных партый (КРАПП) для падрыхтоўкі перамоўнага працэсу з рэжымам па чатырох пытаннях. Сярод іх і было пытанне пра доступ апазіцыі да электронных дзяржаўных СМІ. Бо апазіцыя, як і сп. Альхавы, лічыць гэтае пытанне надзвычай важным. Экспертную групу ўзначаліў прафесар М.Пастухоў і дамогся падпісання адпаведнага дакумента прадстаўніком Адміністрацыі прэзідэнта М.Сазонавым. Зразумела, што дакумент прадугледжваў вельмі сціплыя магчымасці для апазіцыі. Але гэта яго не выратавала. Бо Лукашэнка дзейнічаў у звыклай для сябе манеры. Ён з'ездзіў на саміт у Стамбул, запрашэнне куды залежала ад факта перамоў. А па вяртанні парваў паперу і звольніў М.Сазонава.

У хуткім часе па парадзе С.Посахава ён распачаў "шырокі грамадскі дыялог" замест перамоваў з КРАПП. Арганізаваная апазіцыя на неакрэслена шырокі дыялог не пайшла. У ім бралі ўдзел "проста дэмакраты" кшталту Ю.Загуменава, А.Фядуты ды ім падобных. У колькасці, здаецца, чалавек 80. Але ўлада аказалася няўдзячнай. Нават са згоднікамі не дамовілася аб доступе СМІ. І шырокі дыялог не прынёс ні грана карысці. Думаю, што і ў далейшым апазіцыя не паддасца на правакацыйныя перамовы.

Тэлевізійнае пытанне надзвычай важнае. Гэта лішні раз пацвердзіла мінуўшая прэзідэнцкая кампанія. Усе тры альтэрнатыўныя кандыдаты былі пастаўлены ў нязручныя, нават здзеклівыя ўмовы. Абмежаваны час, забарона адкрытага эфіру, адсутнасць вопыту рэгулярных публічных прамоваў зрабілі іх выступленні залішне напружанымі, пазбаўленымі лёгкасці, нецікавымі. Лукашэнка наогул адмовіўся ад такой ласкі. Яго і без гэтага штодня паказвала БТ у жывых і дынамічных сюжэтах. Так што выбары адбываліся не на падставе параўнання і ацэнкі розных канцэпцый развіцця краіны, а на падставе параўнання "гаворачых галоў" і клапатлівага мужнага "генералісімуса". БТ свядома ссунула акцэнты, бо невядома, як бы выглядаў генералісімус у адкрытай дыскусіі.

Але несумленна было б сцвярджаць, што апазіцыя не нарабіла памылак і што наогул не існавала верагоднасці перамагчы рэжым. Відавочнай памылкай было занадта позняе вызначэнне адзінага кандыдата, калі да дня галасавання засталося толькі тры тыдні. А да пачатку папярэдняга галасавання — яшчэ меней. Карані гэтай аблуды ляжалі глыбей, чым відавочная нязгода С.Домаша на працягу цэлага месяца зняць сваю кандыдатуру пасля рашэння дэмакратычнай "пяцёркі" (у тым ліку і самога С.Домаша) вылучыць адзіным кандыдатам Ул.Ганчарыка.

Сапраўдная прычына каранілася ў тым, што за год да выбараў адзіны дзеючы цэнтр дэмакратычнай апазіцыі — КРДС назваў тры прозвішчы — М.Чыгіра, С.Домаша і Ул.Ганчарыка — як верагодных кандыдатаў ад аб'яднанай апазіцыі. У чым былі прычыны такога незвычайнага рашэння? Бо, нагадаю, у аналагічнай сітуацыі югаслаўская апазіцыя выбрала лідэра невялікай цэнтрысцкай партыі. Лідэры буйнейшых партый Беларусі прыслухоўваліся да голасу незалежных сацыёлагаў і журналістаў, якія сцвярджалі, што народ чакае нейкага нейтральнага, непартыйнага прафесіянала. Названыя асобы цалкам адпавядалі гэтаму жаданаму іміджу. Таму іх вылучэнне было сустрэта журналістамі з вялікім энтузіязмам.

Больш таго бясспрэчны лідэр незалежных СМІ "Народная воля" разгарнула шырокамаштабную акцыю "Выбар-2001", стрыжнем якой стаў пошук яшчэ большай колькасці асобаў, здатных быць прэзідэнтам Беларусі. Здаецца, было названа каля 130 прозвішчаў. Пры гэтым ініцыятары "Выбару" не жадалі каардынаваць свае дзеянні з КРДС. Вось на фоне гэтай ліхой кампаніі, а можа, і пад яе ўздзеяннем, тройка прэтэндэнтаў, вылучаных каардынацыйным цэнтрам арганізаваных дэмакратычных сіл, замест таго, каб шляхам узаемных кансультацый вылучыць са свайго асяродку лідэра і пачаць фарміраваць аб'яднаную каманду, утварае індывідуальныя каманды, уцягваючы ў іх склад сяброў дэмакратычных партый. Больш таго, "тройка" без узгаднення з КРДС сваім уласным рашэннем пераўтвараецца ў "пяцёрку" за кошт П.Казлоўскага і С.Калякіна.

Такім чынам, на пачатку вясны "прэзідэнцкага года" з боку апазіцыі складваецца абсалютна штучная канструкцыя (альбо план) выбарчай кампаніі. Ініцыятыва канцэнтруецца ў межах "пяцёркі", якая і фармальна, і фактычна не залежыць (і не лічыцца!) ад КРДС. Але фактычна карыстаецца людскімі рэсурсамі партый, бо за выключэннем С.Калякіна не абапіраецца ні на якую арганізаваную структуру.

Наяўнасць у складзе "пяцёркі" паважанага Сяргея Іванавіча яшчэ больш падкрэслівае яе ненатуральнасць. Бо першапачатковая ідэя была ў стварэнні механізма вылучэння непартыйнага кандыдата. Можна смела сцвярджаць, што ў выпадку (праўда, малавераогодным) вылучэння "пяцёркай" адзіным кандыдатам С.Калякіна арганізацыі КРДС не падтрымалі б яго кандыдатуру, бо яго партыя нават не ўваходзіць у КРДС. І гэта азы палітычнай культуры. Дэмакратычныя партыі не могуць падтрымліваць лідэра партыі, якая не заяўляе пра свае дэмакратычныя ідэалы.

Можна папракаць КРДС і арганізацыі, якія ўваходзілі ў яго склад, за тое, што занадта доўга назіралі за дзеяннямі "пяцёркі", доўга ўгаворвалі яе сціснуцца да "адзінага". Можна тлумачыць гэтую страту ініцыятывы правакацыйнымі паводзінамі БСДП (НГ) і партыі працы, якія фактычна заблакіравалі ў гэты час дзейнасць КРДС. Але ўсё гэта — другаснае. Корань — у памылковым рашэнні будаваць выбарчую кампанію на "незалежных" кандыдатах. Корань — у тым, што была зроблена стаўка пабудаваць занадта шырокую кааліцыю, удзельнікі якой былі схільныя выкарыстоўваць кансенсус як зброю шантажу. Але было ўжо позна. Усе чакалі рашэння "пяцёркі".

КРДС ажыў толькі тады, калі ўсе пяць "дэмакратычных" кандыдатаў у атачэнні яшчэ пятнаццаці не менш дэмакратычных рынуліся на збор подпісаў. Стала ясна, што кампанія прайграецца. Адчайнымі намаганнямі лідэраў дэмакратычных партый і асабліва аргкамітэта руху "За новую Беларусь" на чале з В.Лявонавым у рэшце рэшт удалося прымусіць "пяцёрку" назваць прозвішча "адзінага". Але яшчэ месяц працягвалася валтузня з вызначэннем умоў аб'яднання двух прэтэндэнтаў, якія сабралі больш за 100 тысяч подпісаў, але толькі адзін з іх быў "адзіным".

Не толькі паводзіны С.Домаша, але і астатніх удзельнікаў "пяцёркі", заслугоўваюць асуджэння. Уся апазіцыя не была падрыхтавана да адзінства. І яе "грамадзянская" частка, і яе "сацыяльная" частка, якія, па ацэнках сацыёлагаў, ахопліваюць адпаведна 10% і 30% грамадства, былі дэзарыентаваны той какафоніяй, якую стварылі дэмакратычныя прэтэндэнты і незалежныя СМІ. Уся гэтая сітуацыя — толькі ілюстрацыя да той ролі, якую ў грамадстве павінны адыгрываць палітычныя партыі. Ілюстрацыя адмоўная. Але вельмі пераканаўчая. Хай сабе, як сцвярджаюць некаторыя сацыёлагі, партыі падтрымліваюць 2—3% насельніцтва. Але без арганізаванай сілы, якая дзейнічае ў адпаведнасці з нормамі палітычнай культуры, грамадства атрымлівае тое, што атрымала Беларусь 9—10 верасня.

Таму прыхільнікам і актывістам дэмакратычных партый, якія не пабаяліся падкласці свае сэрцы і рукі пад гэтую рыхлую кампанію, я хачу нагадаць словы з Евангелля: "Вы — соль зямлі". Не гніецеся і не хнычце. А астатняй апазіцыі нагадаць мудрасць амерыканскага Дзікага Захаду: "не страляйце ў піяніста, ён іграе, як умее. Паіграйце лепей, калі можаце".

Народная Воля
18 СНЕЖНЯ 2001 г.

ДАЙДЖЕСТ

Немецкие спецслужбы ждут терактов

Немецкая спецслужба GSG-9, специализирующаяся на борьбе с терроризмом, приведена в состояние боеготовности в связи с угрозой теракта. Как сообщается, бойцы спецподразделения, раздислоцированного под Бонном (земля Северный Рейн-Вестфалия), готовы в любую минуту вылететь на выполнение поставленных задач. Между тем представители МВД ФРГ призвали жителей страны не поддаваться панике в связи с распространенными германской прессой сообщениями о запланированной на воскресенье "акции устрашения" исламских экстремистов. Как пишет журнал "Фокус", террористы, вероятно, постараются воплотить свою угрозу на общественном транспорте.

Парижский клуб списал Пакистану 30% долга

Парижский клуб кредиторов провел реструктуризацию внешнего долга Пакистана, который составляет $12,5 млрд, списав при этом около 30% задолженности.

Согласно новому соглашению, достигнутому в Париже, оплата торговых кредитов растягивается на 23 года с мораторием на выплаты в ближайшие пять лет. Выплаты по кредитам, выданным на социальные программы и программы развития, будут производиться в течение 38 лет с отсрочкой платежей на ближайшие 15 лет.

Одновременно руководство Парижского клуба рекомендовало странам-кредиторам Пакистана провести отдельные двусторонние переговоры о конвертации задолженности.

Местные аналитики высказывают мнение, что беспрецедентная реструктуризация внешнего долга Пакистана является прямым следствием его поддержки антитеррористической операции в Афганистане.

ИТАР-ТАСС.

Анархисты в Брюсселе угощали полицию "коктейлем Молотова"

В ходе недавнего марша по улицам Брюсселя антиглобалисты повредили несколько зданий и автомобилей. По словам полицейских и очевидцев, демонстранты использовали бутылки с "коктейлем Молотова". Всего в марше приняли участие около 700 человек. Участники акции протеста выражали анархистские взгляды. "Нет справедливости, нет мира, бейте полицейских", — скандировал один из демонстрантов. В направлении стражей порядка были брошены две бутылки с зажигательной смесью.

На одном из участков следования демонстрации полиция вынуждена была применить водометы. Сообщений об арестованных и раненых не поступало.

"Рейтер".

Назарбаев стал "халыком"

Парламент Казахстана решил присудить президенту страны Нурсултану Назарбаеву звание "Халык Кахарманы" — "Народный герой". На внеочередном совместном заседании обеих палат — мажилиса и сената — депутаты после нескольких выступлений о заслугах президента перед народом Казахстана практически единогласно проголосовали за присуждение Назарбаеву высшего звания. Против проголосовал лишь один депутат мажилиса и несколько человек воздержались. Звание "Народный герой" присваивается в Казахстане "за выдающиеся заслуги перед республикой, гражданские и ратные подвиги во имя свободы и независимости". Героям вручается знак особого отличия — Золотая звезда.

Латыши отправляются покорять высшую точку Антарктиды

Альпинисты из Латвийского высокогорного клуба отправились в первую экспедицию в Антарктиду. Их цель — покорить высшую точку этого континента — гору Винсон. Это восхождение должно стать последним этапом программы Латвийского высокогорного клуба "Семь вершин для Латвии". Цель этой программы состоит в том, чтобы латвийские альпинисты присоединились к числу примерно 30 покорителей вершин мира, которые уже поднялись на высшие точки всех континентов планеты. Кроме того, впервые в мире эта программа реализуется национальной командой, которая, таким образом, претендует на занесение в Книгу рекордов Гиннесса. Латвийские альпинисты уже покорили: в Европе — Эльбрус (5642 м), в Азии — Эверест (8848 м), в Северной Америке — Маккинли (6194 м), в Южной Америке — Аконкагуа (6960 м), в Африке — Килиманджаро (5895 м) и в Австралии — пик Костюшко (2228 м).

"Интерфакс".

ВОЙНА

Мститель неуловимый

Бен Ладена все еще не могут найти

Недавний штурм, организованный морскими пехотинцами США, а также атаки в воскресенье сил Восточного альянса укреплений Тора-Бора и Белых гор на востоке Афганистана не принесли удовлетворения ни новым афганским властям, ни Белому дому: бен Ладена нигде нет. О "неоправданности понесенных человеческих жертв" уже заявил руководитель военной операции США в Афганистане генерал Томми Фрэнкс.

Усама бен Ладен.

Фото из газеты USA Today.

Как сообщает "Ассошиэйтед Пресс", в результате последних боев в плен захвачено 25 боевиков, 200 уничтожено. По словам Мохаммеда Замана, одного из командующих Восточным альянсом, перед началом последнего наступления бойцы коалиции незаметно подобрались к позициям Аль-Каеды. После чего был начат штурм с разных сторон, который в течение нескольких часов завершился полной победой сил альянса. По словам М.Замана, судьба Усамы бен Ладена остается до сих пор неизвестной. Он отметил, что нескольким сотням боевиков Аль-Каеды, возможно, удалось бежать и в настоящее время они пробираются к границе с Пакистаном, расположенной в нескольких километрах от пещер Тора-Бора.

По утверждениям многих источников, у американской военной разведки были неопровержимые доказательства пребывания бен Ладена в подземном комплексе Тора-Бора еще две недели назад — до начала штурма этого района пуштунскими племенами, перешедшими на сторону нового правительства Афганистана. Еще на прошлой неделе, по утверждению "Вашингтон Пост", американским радиоперехватчикам удавалось поймать несколько переговоров, свидетельствующих о пребывании бен Ладена в Тора-Бора. Однако после того как там начались бои, "террористу и ньюсмейкеру" №1 в мире снова удалось, похоже, обвести умных американцев и найти себе новое пристанище.

По словам генерала Фрэнкса, у Пентагона уже разработан специальный план того, где и как будут содержаться лидеры "Аль-Каеды" в случае их захвата — их поместят под охрану морских пехотинцев в лагере "Райно" под Кандагаром или переправят на один из авианосцев. Но что будут делать войска США, если бен Ладен покинул территорию Афганистана и укрылся по ту сторону пакистанской границы, генерал пока не знает.

Между тем власти Пакистана, судя по всему, крайне озабочены возможностью переноса контртеррористической операции на свою территорию, так как вероятность переноса боевых действий, по утверждению специалистов, на территорию Пакистана весьма высока — американцы, преследуя бен Ладена, вряд ли перед чем-нибудь остановятся.

В связи с этим на границу с Тора-Бора уже начали переброску дополнительных сил пакистанской армии. Там уже создано 300 новых опорных пунктов, что позволяет пакистанским генералам уверенно заявлять о полном закрытии этого участка границы — бежать на этом направлении из Афганистана лидеры "Аль-Каеды" уже точно не смогут. Принимаются дополнительные меры безопасности и в других частях страны. "Мы сделали практически невозможным для Усамы бен Ладена и его сподвижников укрыться на территории Пакистана", — заявил министр внутренних дел Пакистана Моинуддин Хайдер.

Втягивание Пакистана в вооруженный конфликт между США и Афганистаном, очевидно, будет приносить все новые и новые сотни человеческих жертв. Удивительно, но причиной всего этого является один-единственный человек — мститель неуловимый Усама бен Ладен...

Александр СИЛИЧ.

Усилия Восточного альянса оказались тщетными.

Фото из газеты "Лос-Анджелес Таймс".

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Энцыклапедыя "Народнай волі", выпуск №33

Антоні Генрык Радзівіл

Паклаў на музыку "Фауста"

25 кастрычніка 1835 года ў Берлінскай пеўчай акадэміі прайшла тэатральная прэм'ера оперы Антонія Генрыка Радзівіла, напісанай на лібрэта Ёгана Вольфганга Гётэ "Фаўст".

20 ліпеня 1999 года ў тэатры оперы і балета ў Мінску сабраліся прыхільнікі опернага мастацтва, каб далучыцца да гэтага выдатнага твора. Згаданая опера гучала па-беларуску ў перакладзе лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Васіля Сёмухі, раней удастоенага гэтай высокай узнагароды за пераўвасабленне самой трагедыі "Фаўст".

Пастаноўка оперы "Фаўст" зноў засведчыла, што нігілісты розных масцей глыбока памыляюцца (а некаторыя і свядома не хочуць прызнаваць гэтага), калі працягваюць скептычна разважаць аб культурнай адсталасці беларусаў у мінулым. Бо оперу напісаў Антоні Генрык Радзівіл. Акрамя радзівілаўскай, у яго жылах цякла і кроў Агінскіх. Як і Радзівілы, Агінскія таксама з'яўляліся адным са старажытных і найбольш уплывовых родаў Вялікага княства Літоўскага. Сярод іх было нямала музыкантаў.

Пра Міхала Клеафаса Агінскага ведае ці не кожны, ва ўсякім разе захапляецца яго неўміручым паланезам "Развітанне з Радзімай", што найчасцей гучыць як "Паланез Агінскага". А быў жа яшчэ і Міхаіл Казімір Агінскі, якога сучаснікі празвалі "гетманам-кларнетам". Ён сапраўды з'яўляўся вялікім гетманам літоўскім, а мянушку "кларнет" атрымаў за апантанае захапленне музыкай. Да ўсяго любіў тэатр, розныя масавыя відовішчы. У яго рэзідэнцыі ў Слоніме ставіліся і балетныя спектаклі. Сам пісаў музыку. Не абыходзіў увагай камерна-інструментальныя жанры.

Антоні Генрык з'явіўся на свет 13 чэрвеня 1775 года ў Вільні, дзе тады Радзівілы жылі. Першапачатковую адукацыю атрымаў дома. Разам са старэйшым братам Людвікам Мікалаем з юных гадоў навучаўся граць на віяланчэлі, захапляўся жывапісам, сам маляваў. Не цураўся і дакладных навук, з якіх больш падабалася матэматыка.

У 1792 годзе разам з братамі Людвікам, Анджэем, Міхалам паехаў вучыцца ў Германію. Не прайшло і двух гадоў, як Антоні, тады студэнт Гецінскага універсітэта, па запрашэнні прускага караля перабраўся ў Берлін. Манарх часта бываў у Небарове і добра ведаў Радзівілаў. Праўда, была і іншая прычына, што мусіла Вільгельма II звярнуць увагу на Антонія: збіраўся выдаць за яго сваю стрыечную сястру, дачку Аўгуста Фрыдрыха — князёўну Луізу з Гегенцолернаў.

Была, аднак, перасцярога, што сама Луіза на замуства не згодзіцца, бо, ведаючы сабе цану, не аднойчы адпрэчвала самых уплывовых сватоў. Але гэтым разам праблема не ўзнікла. Як толькі ўбачыла Антонія, хоць была далёка не дзяўчынка, мела амаль дваццаць пяць гадоў, закахалася. Антоні адказаў узаемнасцю. Не зважаючы, што быў за сваю абранніцу маладзей на пяць гадоў, цвёрда вырашыў ажаніцца з ёю. Вянчанне адбылося 17 красавіка 1796 года. Шчаслівыя бацькі Антонія падарылі маладым вялікі палац у Берліне. З гэтага моманту Антоні Радзівіл, як неаднойчы прызнаваўся сябрам і блізкім, змог цалкам прысвяціць сябе музам.

А служэнне музам для яго было найперш у адданасці музыцы. Ні вайсковая, ні дзяржаўная службы не цікавілі. Галоўнымі былі сям'я і музыка. Дзяцей любіў — нарадзілася чатыры дачкі і чатыры сыны. Дзве дзяўчынкі памерлі ў раннім узросце. Суцяшэнне знаходзіў у музыцы.

З надыходам лета на некалькі месяцаў развітваўся з горадам, бавіў час на ўлонні прыроды, жывучы ў сваёй вясковай сядзібе Руханберг. А вярнуўшыся ў Берлін, станавіўся надзіва зычлівым, кампанейскім, ахвотна прымаў гасцей. Дом Радзівілаў у Берліне неўзабаве пачалі называць "палацам на Вільгельмштрасе". Там пабывалі артысты, пісьменнікі, палітыкі. Гаспадар граў на віяланчэлі ці гітары, спяваў. Мог павесяліць прысутных, намаляваўшы іх партрэты, часам шаржавыя. Так пазней было і ў Познані, і ў Вільні, дзе жыў з сям'ёй.

Пакрысе ў Антонія наступае ўпэўненасць ва ўласнай кампазітарскай дзейнасці. Ён піша музыку, якая вызначаецца адметнасцю, сведчыць аб тым, што талент, няхай і няпроста, самасцвярджаецца. На Радзівіла звярнулі ўвагу выканаўцы, зацікавіліся ім выдаўцы.

У 1802 годзе пабачылі свет тры рамансы Антонія, яшчэ праз два гады быў выдадзены дуэт. У авалоданні сакрэтамі кампазітарскага майстэрства шмат дало знаёмства з вядомымі музыкантамі. Асабліва цесныя стасункі ўзніклі ў яго з берлінскім кампазітарам і вядомым музычна-асветным дзеячам Карлам Фрыдрыхам Цэльтэрам. Радзівіл цікавіўся літаратурай, у прыватнасці, паэзіяй. Уважліва сачыў за творчасцю Гётэ, якім захапляўся. З нецярпеннем чакаў працягу "Фаўста", што ўпершыню з'явіўся ў 1780 годзе ў фрагменце (першая частка цалкам выйшла ў 1808-м).

Значнасць напісанага разумеў і сам Гётэ, таму з цікавасцю паставіўся, каб пакласці трагедыю на музыку. Даведаўшыся ад Цэльтэра, што за гэтую справу гатовы ўзяцца Антоні Радзівіл, да прапановы паставіўся, мякка кажучы, спакойна, бо гэтае імя гаварыла няшмат. На схіле свайго жыцця, калі Моцарта ўжо сорак гадоў не было ў жывых, Гётэ прызнаваўся, што хацеў бачыць кампазітарам менавіта яго, бо жадаў, каб музыка "Фаўста" набліжалася да музыкі "Дон Жуана". Але пры жыцці Моцарта з прапановай да яго не звяртаўся.

Тады ж, у 1808 годзе, настойваў, каб за музыку ўзяўся сам Цэльтэр. Той нічога пэўнага не адказаў, бо быў упэўнены, што рабіць гэта трэба Антонію. Праўда, у 1810 годзе напісаў некалькі песень, сярод іх была і "Балада аб Фульскім каралі". І працягваў настойваць, што музыку ўсё ж павінен пісаць Радзівіл. Нарэшце, Гётэ згадзіўся на асабістую сустрэчу з Антоніем, якая і адбылася і красавіка 1814 года ў Веймары. Як высветлілася, Радзівіл сёе-тое з "Фаўста" пераклаў ужо на музыку. Пазней Гётэ прызнаецца: "Візіт князя Радзівіла абудзіў пачуцці, якія цяжка суняць; яго геніяльная парывістая кампазіцыя да "Фаўста" нарадзіла далёкую яшчэ надзею на прадстаўленне гэтага незвычайнага твора ў тэатры".

Некалькі фрагментаў з оперы, пакладзеныя на музыку Антоніем, упершыню былі вынесены на суд публікі ў 1816 годзе. Прэм'ера праходзіла ў яго берлінскім палацы, а першымі слухачамі сталі тыя, каго добра ведаў і любіў. Чарговае выкананне некаторых песень і інструментальных нумароў адбылося 24 мая 1820 года. І таксама ў Берліне. Але і сам Антоні, і прыхільнікі яго музыкі разумелі, што пра оперу як пра твор можна гаварыць толькі тады, калі яна стане тэатральным прадстаўленнем. Няхай і ў фрагментальным паказе. Гэты чаканы момант надышоў 7 чэрвеня 1820 года. Спектакль ладзіўся ў замку прускага караля ў Манбіжу, што непадалёку ад Берліна. Пастаноўку Радзівіл прымеркаваў да 50-годдзя сваёй жонкі.

Відовішча атрымалася пасапраўднаму маляўнічым. Шмат папрацавалі змешаны хор і аркестр Берлінскай пеўчай акадэміі, прафесіянальныя выканаўцы. Антоні паклапаціўся, каб Гётэ, які не змог прыехаць на спектакль, усё ж прысутнічаў. І не ў зале, а на сцэне. А эфект прысутнасці аўтара трагедыі быў дасягнуты арыгінальным прыёмам. Выканаўцу ролі Духа Зямлі была прапанавана маска, якая ўвасабляла воблік Гётэ. Тым самым лішні раз даказвалася, што вобраз Духа Зямлі і сам паэт у многім аднолькавыя па сваім светапоглядзе.

Антоні Радзівіл аказаў вялікае ўражанне на Фрыдэрыка Шапэна, першы крок да знаёмства з якім, верагодней, зрабіў у верасні 1828 года, калі Шапэн праязджаў праз Познань. Даведаўшыся пра гэта, Антоні запрасіў яго ў сваю рэзідэнцыю. Шапэн у гасцях выконваў творы Бетховена, Гумеля, Гайдна, Моцарта і, вядома, свае. Радзівіл быў у захапленні, а пасля сыграў некалькі ўласных твораў, якія спадабаліся Шапэну. Гэта зблізіла іх.

Па вяртанні ў Варшаву аб сваіх уражаннях Шапэн падзяліўся ў лісце Віту Вайцяхоўскаму: "Я правёў там тыдзень. Ты не паверыш, як мне было ў яго добра... Мне з цяжкасцю ўдалося адмовіцца ад далейшага гасцявання... Я б застаўся, пакуль бы мяне не прагналі". І як працяг: "Ты не ведаеш, як ён любіць музыку. Паказваў мне свайго "Фаўста", і я знайшоў там шмат рэчаў, так добра задуманых, нават геніяльных, што гэтага я ніколі не мог чакаць... Сярод іншых ёсць там адна сцэна, у якой Мефістофель спакушае Грэтхен, іграючы на гітары і распяваючы пад яе акном, а адначасова чуваць спяванне хора з суседняга храма; гэты кантраст выклікае вялікае ўражанне ў выкананні; у рукапісе відаць, што вакальная партыя напісана па-майстэрску..."

Шапэн прысвяціў свайму новаму сябру Паланез для фартэпіяна і віяланчэлі, які ўпершыню прагучаў у Антоніне. Тады ж адбылося і выкананне яшчэ аднаго твора-прысвячэння — Трыо для фартэпіяна, скрыпкі і віяланчэлі. Пасля ад'езду госця Антоні, відаць, палічыў, што не ўсё сказаў наконт свайго захаплення, таму пасляшаўся паслаць Шапэну ліст:

"Антонін, 4 лістапада 1829 года.

Мой дарагі Шапэн!

Я глыбока ўдзячны Вам, Ваша міласць, за тое, што Вы так ласкава прысвяцілі мне Трыо, напісанае Вамі. Ці не маглі б Вы гэтаксама ласкава паскорыць яго друкаванне, каб я мог сыграць яго разам з Вамі, калі Вы будзеце ў Познані праездам па дарозе ў Берлін. Прыміце яшчэ раз, мой дарагі Шапэн, запэўніванне ў той глыбокай цікавасці, якую мне ўсяляе Ваш талент, гэтаксама, як запэўніванне ў глыбокай пашане, якую я да Вас адчуваю. Князь Антоні Радзівіл".

Пры жыцці Антоні тэатральных пастановак "Фаўста" больш не было. Ды і жыць князю заставалася нядоўга (памёр 7 красавіка 1833 года). Паступова яго ўзаемаадносіны з уладамі пагоршыліся. Незадавальненне з боку іх выклікала палітыка, якую праводзіў Антоні, калі з'яўляўся намеснікам караля ў Вялікім княстве Познаньскім. Да ўсяго брат Антонія Міхал Г.Гедзон быў прыхільнікам Напалеона, а тут падчас паўстання 1830 года стаў галоўнакамандуючым паўстанцкімі войскамі. Прускі манарх пазбавіў Антонія пасады намесніка. Ён вярнуўся ў Берлін, дзе і пражываў да апошніх сваіх дзён.

Пасля смерці Радзівіла фрагменты "Фаўста" выконваліся неаднойчы, але знаёмства публікі з усёй операй адбылося толькі 25 кастрычніка 1835 года, калі ў Пеўчай акадэміі прайшла прэм'ера. Опера неаднаразова выконвалася ў 1837—1850 гадах. На радзіму ж Антоні, у Вільню, твор дайшоў у 1844 годзе, калі з'явіўся польскі пераклад І.Завадскага.

Да месца сказаць, што Антоні Радзівіл пакінуў пасля сябе не толькі выдатную оперу. Ён стаў заснавальнікам берлінскай лініі Радзівілаў. Родная сястра Жаклін Кенэдзі, у прыватнасці, выйшла замуж за прапраўнука Антонія Станіслава Альбрэхта Радзівіла, а хросным бацькам іх дачкі Ганны Крыштыны Радзівіл у 1961 годзе стаў прэзідэнт ЗША Джон Кенэдзі.

Міхась ЯНОВІЧ.

Пра Антонія Генрыка Радзівіла можна прачытаць:

Скарабагатаў В. Лёс падарыў Гётэ музыку Радзівіла. "Мастацтва", 1995, №4.

Собалева Н. Агмень родавы, агмень культурны. "Мастацтва", 1995, №8.

Собалева Н. "Геніяльная парывістая кампазіцыя...". "Мастацтва", 1995, №9.

ДОКУМЕНТЫ ИСТОРИИ

"Последние новости" Минска 1918 года

В Государственном архиве Минской области хранится уникальное периодическое издание — газета "Последние новости". Она выходила в Минске в 1918 году. Сохранилось всего два номера этой газеты, и оба они находятся в вышеупомянутом архиве. Вот о чем писали "Последние новости" в декабре 1918 года, то есть сразу после окончания немецкой оккупации Беларуси.

"Приказ №1 к войскам и населению гор.Минска

...Именем Рабоче-Крестьянской власти приказываю:

1. Прекращается всякого рода продажа спиртных напитков. Лица, имеющие запасы таковых, должны в двухдневный срок заявить Чрезв. Комиссии. За появление в нетрезвом виде на улицах и публичных местах арестовываются и предаются Суду В.Р.Т. ...

Минск, 11 декабряВоенный комиссар КРИВОШЕЙН"

"Приказ №2

Военно-Революционный Комитет приказывает:

1. Прекратить грабежи и самочинные обыски. Обыски могут производиться только по ордерам Военно-Революционного Комитета или Чрезвычайной комиссии по борьбе с контрреволюцией за подписями их председателей. Захваченные на месте преступления будут подвергнуты расстрелу.

2. За агитацию против Советской власти, распространение провокационных слухов, сеющих панику среди населения, арестовывать и передавать в распоряжение Военно-Революционного Комитета.

3. Часовую стрелку перевести по Петроградскому времени.

Минск, 11 декабряПредседатель Минского Губернского ВРК И.Рейнгольд".

"Что такое "осты"? Это нехитрая механика немецких оккупационных властей, посредством которой они заработали в занятых областях не один десяток миллионов. Они пришли в русские города и деревни, изъяли из обращения русские деньги и ввели специальные "оккупационные рубли" — "осты". Но менять русский государственный рубль на свой ост — рубль ничем не гарантированный, показалось немцам комбинацией, недостаточно выгодной. Немцы придумали более выгодный гешефт: объявили ост-рубль двойным рублем, т.е. русский рубль свели на оккупационный полтинник..."

"...Девять месяцев прожил наш край без почты и без телеграфа. Весточки от родных и друзей из России обыватель мог получить только с оказией... Мы полагаем, однако, что почтово-телеграфные сношения с Россией будут восстановлены в течение ближайших дней."

"Демаркационная линия между Советской Россией и оккупированной областью в настоящее время находится за ст.Заславль."

"Минский Военно-Революционный Комитет сделал уже постановление о курсе ост-денег: марка — 50 коп., 1 ост-рубль — 1 русск. рублю."

"Бюро Минской федерации анархистов помещается в бывшей гостинице Гарни, угол Захарьевской и Богадельной, комната №9."

"Приказ №9

Предписывается жителям предместья гор.Минска Козырево и в пределах 25 верст окрестностей Козырево вернуть в 3-дневный срок со дня опубликования настоящего приказа имущество, расхищенное с бараков, расположенных в этом районе. Виновные в неисполнении настоящего приказа будут наказаны по всем строгостям военно-революционного времени, вплоть до расстрела.

12 декабря 1918 г.Председатель Минского Губернского ВРК Рейнгольд Комиссар Народного хозяйства А.Рощинский".

Т.А.СТЕПАНОВА, ведущий научный сотрудник.

ПАМЯЦЬ

Першы раз Івана Фурмана забіла вайна, а другі раз — змыў дождж...

У 1993 годзе выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" выдала гісторыка-дакументальную хроніку "Памяць" Гродзенскага раёна. Апублікаваныя на яе старонках новыя імёны загінуўшых абаронцаў Айчыны і ахвяраў вайны надалі імпульс нашай гарадской ветэранскай арганізацыі да практычных дзеянняў. Тады мы атрымалі падтрымку Скідзельскага гарвыканкама і яго былога старшыні Аляксандра Восіпавіча Казлова. На адшуканыя грашовыя сродкі заказалі мармуровыя пліты, на іх да 50-годдзя Вялікай Перамогі занеслі больш за 400 імёнаў загінуўшых савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў, якія раней адсутнічалі на брацкай магіле.

Яшчэ праз тры гады ўдалося ўвекавечыць у мармуры памяць землякоў, загінуўшых на фронце, замучаных у фашысцкіх лагерах смерці, расстраляных акупантамі. 2330 з іх сталі ахвярамі фашысцкага генацыду толькі ў Трэблінцы і Асвенцыме.

